# БАЯВЫ ЎДАРНЫ БАТАЛЬЁН

**Аўхачоў Феадосій Міхайлавіч нарадзіўся ў 1909 годзе ў вёсцы Машавое Касцюковіцкага раёна. У радах Савецкай Арміі з 1934 года. Закончыў бранятанкавую школу. Вялікую Айчыйную вайну пачаў кямандзірам танкавага падраздзялення. У 1944 годзе быў накіраваны ў Войска Польскае, дзе камандаваў танкавым батальёнам. У саставе Першай Польскай арміі ўдзельнічаў у фарсіраванні Віслы, вызваленні Варшавы і многіх іншых гарадоў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 мая 1946 года.**

Аўхачоў ускочыў на крыло разбітага франтавымі дарогамі "газіка", у знак развітальнага прывітання ўзняў руку. Вось і даводзіцца пакідаць таварышаў. Можа назаўсёды. Хто ведае, што ўперадзе, колькі яшчэ працягнецца вайна. Аўхачоў яшчэ раз абвёў поглядам танкістаў, нібы стараючыся назаўсёды запомніць іх твары.

– Паехалі. таварыш маёр! – крануў Аўхачова за руку вадзіцель "газіка".

У штабе польскага танкавага злучэння савецкага афіцэра сустрэлі вельмі цёпла.

– Рады з вамі пазнаёміцца, – ускінуўшы руку да канфедэраткі, сказаў хударлявы высокі палкоўнік. Ён моцна паціснуў руку, потым, кінуўшы погляд на блішчэўшыя на грудзях Аўхачова баявыя ўзнагароды, дадаў: – Ого, колькі іх у вас! Такому камандзіру можна даверыць нашых жаўнежаў.

Афіцыйны прыём танкавага батальёна заняў нямнога часу. Той жа палкоўнік, прадставіўшы Аўхачова строю польскіх танкістаў. сказаў:

– Гэта ваш новы камандзір Спадзяюся, вы з ім здружыцеся і,.. – палкоўнік падбіраючы патрэбнае слова прышчоўкнуў пальцамі, – ...змаюецеся!

І на самой справе, польскім танкістам спадабаўся іх новы камбат. Заўсёды спакойны, падцягнуты, ветлівы, ён быў для жаўнежаў чулым і адзыўлівым старэйшым таварышам. Ды і Аўхачову па душы прыйшліся яго новыя сябры. Яны ўжо былі абстраляныя, добра ведалі справу і рваліся ў бой. Што ж, пачуцці палякаў былі зразумелыя савецкаму афіцэру – іх радзіму ўсё яшчэ таптаў бот акупанта.

Пасля бою за горад Нойпштат узаемныя сімпатыі камбата і яго падначаляных яшчэ больш узмацнелі. Батальён атрымаў складанае заданне. Трэба было з дэсантам пяхоты на брані ноччу абысці апорныя пункты фашыстаў і ўдарыць па горадзе з поўначы. Марш быў праведзен чотка, арганізавана. З ходу танкісты завязалі бой. Праціўнік быў змяты. Вяла адстрэльваючыся, ён пачаў адступаць у горад. Дзёрзкі

ўдар батальёна Аўхачова з тылу адцягнуў сілы немцаў. Горад Нойнштат быў узят.

Баі змяняліся пераходамі, а ўслед за імі – зноў баі.. І з кожнай паспяхова выкананай аперацыяй рос аўтарытэт камбата. Яго смеласцю, вынаходлівасцю палякі захапляліся, гатовы былі следаваць за ім у агонь і ваду.

Так было і ў час наступлення на Гдыню. Фашысты стварылі тут магутную абарону. Танкісты спрабавалі з ходу прабіцца цераз траншэі праціўніка, але шлях перагарадзіў супрацьтанкавы роў. Марудзіць было нельга ні адной мінуты – фашысты вялі моцны агонь. Аўхачоў аддаў каманду: частка танкаў працягвае бой, астатнія робяць праход цераз роў. Хутка батальён пераадолеў гэтую перашкоду. Танкісты літаральна на плячах фашыстаў уварваліся ў Гдыню. Упарта супраціўляючыся, гітлераўцы пачалі адыходзіць у порт. Там пад парамі стаялі транспартныя судны. Ворагі разлічвалі ўцячы морам. Гэтага нельга было дапусціць.

Батальён Аўхачова атрымлівае загад: прарвацца ў порт, захапіць яго. Выбраўшы самы кароткі маршрут, камбат павёў свае машыны ўперад. Але што гэта? Уперадзе – паўразбураны мост.

Часу для роздуму не было. Не было яго і для таго, каб шукаць іншую пераправу. Заставалася толькі адно – правесці танкі па абломках маста. Рызыка, вядома, была вялікая. Але іншага шляху не было.

– Пойдзем? – запытаў Аўхачоў танкістаў.

– Пойдзем і пройдзем! – дружна адказалі жаўнежы. І танкі пайшлі. Першым – камандзірскі. Вось пройдзен адзін пралёт маста, другі, трэці... Бераг! Услед перабраліся астатнія машыны. Батальён працягваў наступленне.

Гэта быў сапраўдны скачок праз немагчымае!

**Баявы ўдарны батальён // Магілёўская праўда. — 1970. — 3 сакавіка. — С. 4.**